**КРЭНЬ ІВАН ПЛАТОНАВІЧ**



Беларускі гісторык. Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2000). Выдатнік народнай асветы БССР (1972). Кандыдат гістарычных навук (1981), прафесар (1991). Нарадзіўся 30.11.1936 г. ў в. Кузявічы Баранавіцкага раёна. Скончыў Гродзенскі педінстытут (1959). У 1959-67 гадах працаваў дырэктарам школ у Радунскім і Воранаўскім раёнах. З 1967 г. ў Гродзенскім педінстытуце (з 1978 універсітэце): старшы выкладчык, сакратар парткома, дацэнт. З 1990 года загадчык кафедры гісторыі Беларусі, з 1995 года дэкан факультэта гісторыі і культуры. У 1988-90 гг. працаваў намеснікам загадчыка Дома палітасветы – рэктарам універсітэта маркісзму-ленінізму Гродзенскага абкома і гаркома КПБ. Аўтар шэрагу навучальных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі, кніг грамадска-палітычнага характару, гісторыка-дакументальнай хронікі “Памяць”. Узнагароджаны Ганаровымі граматамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і Міністэрства асветы БССР, ЦК ЛКСМБ, Ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (1970), Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2000). Ганаровы прафесар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы (2004).

**Бібліяграфія:**


1. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раёна / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў (гал.рэд.) і інш.; мастак Э.Э.Жакевіч. – Мінск: БелЭн., 2004. – С. 436 — 437.